

# Урок 80

Дапоўні разважанне. 




1. **Першае няпоўнае дзялімае** — 6 соцень.
   У запісе дзелі будуць ... лічбы.
   Дзялю ... . Множу ... .
   Аднімаю ... . Параўноўваю ... .
   Астача роўная ... .
2. **Другое няпоўнае дзялімае** — 2 дзясяткі.
   Дзялю 2 на 3, атрымліваю 0. Запісваю другую лічбу дзелі — 0. Множу 0 на 3, атрымліваю 0. Аднімаю ... . Параўноўваю ... . Засталося падзяліць ... дзясяткі. Буду іх дзяліць ... .
3. **Трэцяе няпоўнае дзялімае** — ... .
   Дзялю ... . Множу ... . Аднімаю ... . Параўноўваю ... .
4. Чытаю адказ — ... .

**1.** Вылічы. Растлумач вылічэнні.

9624 : 3 62 439 : 3 936 246 : 3

**2.** Вылічы.

1242 : 6 – 981 : 9 4249 : 7 + 45 567 : 9

1545 : 5 + 615 : 3 29 421 : 7 – 8872 : 8

**3.** Складзі і рашы задачу.

| Скорасць, км/г | Час, г | Адлегласць, км |
|---|---|---|
| аднолькавая | 5 | ? } 40 |
| | 3 | ? |

**4.** Два трактары ўзаралі аднолькавыя па плошчы палі. Першы трактар працаваў 8 г, узорваючы па 1 га 50 а ў гадзіну. Колькі часу працаваў другі трактар, калі ён узорваў па 2 га за гадзіну?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 80



**5.** За тыдзень і 3 дні Юра прачытаў 80 старонак аповесці. Колькі старонак Юра прачытаў за тыдзень, калі кожны дзень ён чытаў аднолькавую колькасць старонак?

**6.** Калі зімой у Мінску 12 г дня, у Нью-Ёрку 5 г раніцы тых жа сутак. Каторую гадзіну паказвае гадзіннік у Мінску, калі ў Нью-Ёрку 16 г?

**7.** Устаў прапушчаныя лічбы.

$$\times\begin{array}{r} *5*00 \\ 3 \\ \hline 7*6** \end{array} \qquad \times\begin{array}{r} 7*5* \\ 4 \\ \hline 290*6 \end{array} \qquad \times\begin{array}{r} 3*6*01 \\ * \\ \hline *136*2 \end{array}$$

**8.** Разгледзь схему. Растлумач, што абазначаюць выразы.




$75 \cdot 4$  $60 + 75$  $60 \cdot 4 + 75 \cdot 4$  $(60 + 75) \cdot 4$

? Выканай дзяленне з астачай.

$3 : 5$  $2 : 15$

**1.** Рашы ўраўненні.

$4128 : x = 4$  $y \cdot 6 = 9000 - 2814$

**2.** На 2 вязаныя шапачкі і 5 вязаных берэтаў пайшло 1 кг 400 г шарсцяной пражы. На шапачку і берэт расходавалі пражы пароўну. Колькі грамаў пражы пайшло асобна на шапачкі і колькі — на берэты?



Правообладатель Национальный институт образования